# ДА ПЫТАННЯ АБ СУАДНОСІНАХ ПАНЯЦЦЯЎ «РЭГІЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ» І «КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ»

***С. В. Гаўрылава,***
*саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук,*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Як адзначаюць даследчыкі, у сучасным свеце на фоне працэсу глабалізацыі ўсё больш узрастае роля рэгіёнаў, узмацняецца іх самастойнае грамадскае і культурнае развіццё, важнае значэнне для якога мае дзейнасць рэгіянальных музеяў. Яны набылі статус культурных, навуковых, у шырокім сэнсе духоўных цэнтраў, што з'яўляецца «естественной реакцией на потребности общества в сохранении, эффективном использовании и воспроизводстве историко-культурного наследия, без которого невозможен процесс просвещения, образования и воспитания, активизации духовной жизни региона» [3, с. 354]. Асобую місію рэгіянальных музеяў падкрэсліваюць у сваіх працах як замежныя, так і айчынныя даследчыкі.

На сённяшні дзень у спецыялістаў не склалася адзінага падыходу ў вызначэнні паняцця «рэгіянальны музей». У першую чаргу гэта звязана з нявызначанасцю самога паняцця «рэгіён», якое, незалежна ад таго, у праблемным полі якой навукі разглядаецца, трактуецца як некаторая тэрыторыя, што характарызуецца адпаведным наборам рыс ці характарыстык, актуальных для канкрэтнай навукі. Так, у залежнасці ад кантэксту ў якасці рэгіёну могуць выступаць адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – раён, вобласць, край і інш., гістарычныя вобласці і больш буйныя тэрыторыі і акваторыі. У Рэспубліцы Беларусь рэгіёны адпавядаюць адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам – абласцям.

У статуце Міжнароднага камітэта рэгіянальных музеяў запісана, што рэгіянальныя музеі вызначаюцца ў шырокім сэнсе як музеі, якія збіраюць, вывучаюць і прадстаўляюць аб'екты і іншы адпаведны змест рэгіёну, у большасці выпадкаў меншага за тэрыторыю краіны (раёна, мясцовасці, горада ці вёскі). Як правіла, яны працуюць у полі прыроднай, сацыяльнай, этнічнай і культурнай гісторыі дадзенага рэгіёну ў агульных ці спецыяльных калекцыях і выстаўках [8]. Гэтае азначэнне вельмі блізка да паняцця «краязнаўчы музей», сфармуляванага, на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыклад, аўтарамі Расійскай музейнай энцыклапедыі: краязнаўчыя музеі, якія носяць комплексны характар, прызваны дакументаваць асаблівасці прыроднага развіцця, гісторыі, гаспадарчага жыцця, культуры і быту вызначанай тэрыторыі ці населенага пункта (рэспублікі, краю, вобласці, раёна, горада, сяла) [6, с. 298]. Часта абодва гэтыя паняцці ўжываюцца як сінонімы. У Беларусі больш за 50 % профільнага складу музейнай сеткі ўтвараюць краязнаўчыя музеі, і ім належыць перавага «в определении профильной принадлежности регионального музея» [5, с. 158].

Камітэт рэгіянальных музеяў адзначае, што рэгіянальныя музеі – самая шматлікая група музеяў, якія працуюць на ўсіх кантынентах ад Арктыкі да тропікаў, маюць розны ўзровень фінансавых рэсурсаў, расказваюць пра ўласную рэгіянальную гісторыю і акаляючае асяроддзе і адыгрываюць усё больш значную ролю ў свеце, сцвярджаючы багацце нашай разнастайнасці і каштоўнасць чалавечага жыцця. Тым самым рэгіянальныя музеі супрацьпастаўляюцца нацыянальным музеям.

У айчыннай музеялогіі рэгіянальнымі з'яўляюцца ўсе музеі, акрамя рэспубліканскіх, сканцэнтраваных, як правіла, у сталіцы краіны, незалежна ад профілю музея (літаратурныя, гістарычныя, краязнаўчыя і г. д.). У аснове гэтага раздзялення ляжыць апазіцыя «сталіца – правінцыя», а слова «рэгіянальны» набывае сэнс «правінцыйны» ў значэнні «які знаходзіцца не ў сталіцы». У адносінах да краязнаўчага музея паняцце «рэгіянальны» ў сэнсе «правінцыйны» з'яўляецца сінонімам, так як ні адзін краязнаўчы музей не знаходзіцца ў сталіцы і па сваёй прыродзе супрацьпастаўлены рэспубліканскім гістарычным/мастацкім/этнаграфічным музеям у адносінах да тэрыторыі, якая з'яўляецца аб'ектам інтарэсаў музея.

У большасці выпадкаў тэрытарыяльны ахоп адлюстраваны ў самой назве музея: у Беларусі краязнаўчы музей можа быць абласным, раённым і населенага пункту. Калі прыняць да ўвагі, што рэгіён і вобласць – гэта сінонімы, то вынікае, што рэгіянальнымі з'яўляюцца толькі абласныя музеі. Ні гарадскія, ні раённыя краязнаўчыя музеі не дадуць наведвальнікам цэласнага ўяўлення пра гісторыю, культуру, прыроду рэгіёну, а толькі яго часткі. Выраз «рэгіянальны музей» у шырокім сэнсе не дасць наведвальніку ніякай інфармацыі, у сваю чаргу вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разы «абласны краязнаўчы музей», «раённы краязнаўчы музей» ці «гарадскі краязнаўчы музей» падказваюць яму, пра якую тэрыторыю вядзецца гаворка ў музеі.

Адной з катэгорый сучаснай класіфікацыі музеяў з'яўляецца катэгорыя культурнай значнасці, адносна якой выдзяляюць музеі рэспубліканскага, рэгіянальнага і мясцовага значэння, а таксама музеі – каштоўныя аб'екты культурнай спадчыны і музеі, уключаныя ў Спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. Аднясенне музея да той ці іншай падкатэгорыі (за выключэннем дзвюх апошніх) часцей за ўсё адбываецца з улікам яго падпарадкавання: сельскага, гарадскога, раённага – гэта музей мясцовага значэння, а абласнога і рэспубліканскага падпарадкавання – рэгіянальнага і рэспубліканскага адпаведна.

Адсутнасць адзінства ў вызначэнні паняцця рэгіянальнага музея выклікае разыходжанні ў яго разуменні і ўжыванні. Часта словы «рэгіянальны» і «мясцовы» ўжываюцца побач у адным кантэксце. Прывядзём для прыкладу некалькі цытат. «Тут вельмі важна выкарыстаць патэнцыял мясцовых рэгіянальных музеяў, асяродкаў культурнага і мастацкага жыцця рэгіёну» [7, с. 8]. «Не першае дзесяцігоддзе адным з самых дзейсных спосабаў знаёмства з рэгіянальнай культурай, мясцовымі гістарычнымі, этнаграфічнымі асаблівасцямі і традыцыямі застаецца наведванне краязнаўчага музея» [4, с. 40]. «Безумоўна, у гэтым шматвектарным працэсе адно з галоўных месцаў займае рэгіянальны музей, як самы выразны маркер культурнай самабытнасці дадзенай мясцовасці, яе захавальнік і транслятар» [2, с. 449]. Зразумела, што паняцце «мясцовы» (ці «лакальны») значна вузей, чым паняцце «рэгіянальны». Размежаванне гэтых паняццяў можна знайсці, напрыклад, у адным з артыкулаў даследчыка музейнай справы Беларусі І. І. Бамбешка: «Менавіта краязнаўчы музей можа рэалізаваць місію культурнага, духоўнага, навуковага і прадстаўнічага цэнтра рэгіёну ці пэўнай мясціны» [1, с. 164].

Для прыкладу, у Еўропе таксама існуюць музеі мясцовай культуры і гісторыі – local museums, якія ў залежнасці ад аб'екта інтарэсу могуць быць музеі гарадоў (city museums) і музеі сёлаў (town museums). У Германіі такія музеі маюць назвы Heimatmuseum (музей малой радзімы) ці Stadtmuseum (музей горада). У Іспаніі адпаведна гэта мясцовыя музеі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(museos locales), якім супрацьпастаўлены нацыянальныя музеі. Гэта музеі па сутнасці сваёй дзейнасці вельмі блізкія да нашых краязнаўчых музеяў.

Разглядаючы суадносіны азначэнняў музея «рэгіянальны» і «лакальны», кандыдат культуралогіі К. Ф. Каткова прыйшла да высновы, што адпаведнікам паняцця «краязнаўчы» з'яўляецца «лакальны» музей, а «рэгіянальны» – гэта статус. «Локальный музей может взять на себя функцию регионального музея, т. е. стать культурным, духовным и даже экономическим центром местности. Но, определяя, может ли музей носить статус регионального, мы должны с позиций междисциплинарного подхода анализировать ту местность, на которой располагается музей, можно ли ее считать регионом как территориальной единицей государства» [5, с. 159]. Некаторыя даследчыкі ў адносінах да ненацыянальных музеяў увогуле і краязнаўчых музеяў у прыватнасці выкарыстоўваюць словы «правінцыйны», «малы» ці «мясцовы».

У айчыннай музеялогіі замацаваўся менавіта тэрытарыяльны прынцып у вызначэнні паняцця «рэгіянальны музей»: як ужо было адзначана вышэй, усе музеі, што знаходзяцца не ў сталіцы (а ў абласцях ці рэгіёнах), – рэгіянальныя, а значыць, паняцці «краязнаўчы» і «рэгіянальны» з'яўляюцца сінонімамі.


1. *Бамбешка, І. І.* Краязнаўчы музей: трансфармацыя дэфініцыі і зместу дзейнасці / І. І. Бамбешка // Веснік Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2017. – № 1 (27). – С. 164–170.

2. *Бяспалая, М. А.* Музей у сацыякультурнай прасторы рэгіёна / М. А. Бяспалая // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. статей / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2012. – Вып. 6. – С. 449–455.

3. *Васильева, Т. Е.* Региональный музей как центр духовной жизни / Т. Е. Васильева // Регионология. – 2009. – № 2. – С. 351–357.

4. *Ганчар, С. М.* Роля і значэнне краязнаўчага музея ў культурным жыцці рэгіёна / С. М. Ганчар // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 24 лістап. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2012. – С. 39–42.

5. *Каткова, К. Ф.* Региональный и локальный музей: соотношение понятий / К. Ф. Каткова // Молодежный вестник Санкт-Петербургского государственного института культуры : сб. ст. аспирантов, магистрантов, студентов. – СПб., 2013. – № 1 (2). – С. 157–160.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Российская музейная энциклопедия : в 2 т. / Мин-во культуры РФ, Российский ин-т культурологии, Ин-т «Открытое общество» (Фонд Сороса) ; гл. ред. А. А. Сундиева [и др.]. – М. : Прогресс ; Рипол Классик, 2001. – Т. 1: А–М. – 416 с. : ил.
7. *Трусаў, А.* Рэгіянальныя музеі і турызм. Роля гістарычна-культурнай спадчыны ў фармаванні беларускай ментальнасці / А. Трусаў // Сучасны стан беларускага краязнаўства і валанцёрскі рух: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 16 крас. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – С. 7–13.
8. Statutes Of The International Committee For Regional Museums (ICR) [Electronic resource]. – Mode of access : http://network.icom.museum/icr/who-we-are/statutes/. – Date of access : 15.01.2018.

# ЦИФРОВЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В ТВОРЧЕСКОМ РАЗВИТИИ МУЗЫКАНТА

***В. М. Глубоченко,***
*кандидат педагогических наук, доцент, профессор кафедры культурологии и психолого-педагогических дисциплин Института повышения квалификации и переподготовки кадров Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творческое развитие личности является важнейшей целью обучения, образования и воспитания [4]. Общество нуждается в творческих людях, поскольку именно творческая личность способна на инициативу, выбор оптимальных способов действия, поиск новых путей развития.

Идея творческого развития личности существует априори. Однако формы, средства и методы реализации этой идеи на протяжении столетий были разными, во многом обусловленными научно-техническим и социально-политическим развитием общества. Пожалуй, главным признаком наступившего тысячелетия является использование цифровых технологий во всех сферах деятельности человека, в том числе в музыкальной культуре и образовании.

Цифровые технологии в музыке представлены многообразно и разнопланово. Любая музыкальная деятельность в той или иной мере допускает или предполагает использование цифровых технологий. Так, стремительная эволюция процесса слушания музыки характеризуется переходом от использования различного типа носителей (CD, DVD, flash-карт) к онлайн-